***Праверце сябе.*** 1. Назавіце асноўныя фактары размяшчэння дрэваапрацоўчай, мэблевай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці. 2. Як можна ацаніць забяспечанасць Беларусі сыравінай для галіны? 3. Якія віды прадукцыі вырабляе дрэваапрацоўчая прамысловасць?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Якія, на ваш погляд, перспектывы развіцця дрэваапрацоўчай прамысловасці? 2. Чаму ў Беларусі пашыраюць вытворчасць паперы і кардону?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Вашы сябры зацікавіліся тым, што ў Беларусі развітая вытворчасць мэблі. З дапамогай карты атласа (с. 58) распрацуйце для іх буклет «Вытворчасць мэблі».

## § 38. Геаграфія лёгкай прамысловасці

***Успомніце.*** *Якая сыравіна выкарыстоўваецца ў лёгкай прамысловасці?*

**1. Структура і фактары размяшчэння лёгкай прамысловасці.** Па характары прадукцыі, якая выпускаецца, у складзе галіны вылучаюцца тэкстыльная, швейная, гарбарная вытворчасць (мал. 128).

Прадпрыемствы лёгкай прамысловасці арыентаваны на наяўнасць працоўных рэсурсаў, таму ствараюцца ў цэнтрах развіцця цяжкай прамысловасці з вялікім попытам на мужчынскую працу, каб заняць працай жанчын. У Беларусі такімі цэнтрамі можна назваць Салігорск, Жодзіна і інш. Лёгкая прамысловасць накіравана на задавальненне попыту насельніцтва. Найбольш спрыяльныя ўмовы для развіцця лёгкай прамысловасці ў тых рэгіёнах, якія забяспечаны працоўнымі рэсурсамі і адначасова з'яўляюцца спажыўцамі гатовай прадукцыі. Важны фактар размяшчэння прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці — выгаднае эканоміка-геаграфічнае становішча.

Чаму выгаднае эканамічнае становішча з'яўляецца важным фактарам для развіцця лёгкай прамысловасці ў Беларусі?

| Лёгкая прамысловасць | |
|---|---|
| Тэкстыльная вытворчасць | тканіны (баваўняныя, ільняныя, ваўняныя, з розных матэрыялаў), ніткі, дываны і дывановыя вырабы |
| Швейная вытворчасць | адзенне, галаўныя ўборы, вырабы з футра, трыкатажныя вырабы, панчохі, шкарпэткі |
| Вытворчасць скур, вырабаў са скуры, абутку | скура, скураная вопратка, пальчаткі, сумкі, абутак |

Мал. 128. Структура лёгкай прамысловасці

Больш за 80 % агульнага аб'ёму вытворчасці тканін, адзення, абутку ў Беларусі прыпадае на прадпрыемствы канцэрна «Беллегпрам». У рэгіянальным разрэзе прадпрыемствы лёгкай прамысловасці размешчаны па краіне раўнамерна, аднак лідарства ў вытворчасці належыць Віцебскай і Брэсцкай абласцям.

**2. Геаграфія тэкстыльнай вытворчасці.** Тэкстыльная вытворчасць з'яўляецца самай буйной па аб'ёме прадукцыі і колькасці занятых у лёгкай прамысловасці і налічвае больш за 200 прадпрыемстваў, якія выпускаюць баваўняныя, ваўняныя і льняныя тканіны.

Баваўняныя тканіны, ніткі, нятканыя матэрыялы вырабляюць з прывазной бавоўны. Найбуйнейшае прадпрыемства па вытворчасці гэтай прадукцыі знаходзіцца ў Баранавічах (мал. 129). Працуюць баваўняныя фабрыкі таксама ў Гродне, Магілёве.

З якіх краін у Рэспубліку Беларусь завозіцца бавоўна?

Асноўныя цэнтры вытворчасці ваўняных тканін: Гродна, Мінск, Слонім. Дываны вырабляюць у Віцебску і Брэсце. У апошнія гады назіраецца скарачэнне выпуску ваўняных тканін. Раней іх выраблялі з прывазной сыравіны. Цяпер акрамя прывазной тонкай мерыносавай воўны выкарыстоўваюць лаўсан, нітрон, ільняныя валокны.



Мал. 129. На Баранавіцкім вытворчым баваўняным аб'яднанні

Самай перспектыўнай у Беларусі з'яўляецца вытворчасць ільняных тканін. Гэта абумоўлена наяўнасцю мясцовай сыравіны і высокім попытам на іх на сусветным рынку. Прадпрыемствы льняной прамысловасці размешчаны пераважна ў раёнах вырошчвання лёну-даўгунцу. Найбуйнейшае прадпрыемства па вытворчасці льняных тканін знаходзіцца ў Оршы.

Назавіце раёны вырошчвання лёну-даўгунцу.

Аршанскі льнокамбінат — флагман у вытворчасці льняных тканін і вырабаў з лёну ў СНД і Еўропе. Прадукцыя камбіната ў 2025 г. адзначана Дзяржаўным знакам якасці.

У Беларусі пасля стварэння ўласнай сыравіннай базы пачала інтэнсіўна развівацца вытворчасць тканін з хімічных валокнаў. Найбуйнейшыя

**Мінск (1)**

**«Камволь», «Сукно»:** ваўняныя тканіны
**«Элема», «Цэнтр моды»:** адзенне
**«Алеся», «Мілавіца», «Інком Фэшн»:** трыкатаж
**«Абутак-Луч»:** абутак
**«Галантэя»:** скураныя сумкі, рамяні

**Мінскае вытворчае гарбарнае аб'яднанне (2):** гарбарная прадукцыя
**Смілавіцкая валюшна-лямцавая фабрыка (3):** валёнкі
**«Эліз» (4):** адзенне
**«Світанак» (5):** трыкатаж

**«Марк Фармэль» (6, 7):** трыкатаж
**«Калінка» (8):** адзенне
**«Купалінка» (8):** трыкатаж

**Віцебск (9)**

**«Віцебскія дываны»:** дываны
**Віцебскі футравы камбінат:** футравае адзенне
**«Васіліна»:** шкарпэткі
**«Белвест», «Марка»:** абутак

**Аршанскі льнокамбінат (10):** ільняныя, сталовыя, пасцельныя, гарнітурна-плаццевыя тканіны, пража

**Гродна (18)**

**«Гроднатэкстыль»:** ваўняныя тканіны
**«Гранітэкс»:** пража, ніткі
**«Элод»:** адзенне
**«Контэ Спа»:** калготкі, шкарпэткі, трыкатаж
**Гродзенскае вытворчае гарбарнае аб'яднанне:** гарбарная прадукцыя
**Гродзенская абутковая фабрыка «Нёман»:** абутак




1. Мінск
2. Гатава
3. Смілавічы
4. Дзяржынск
5. Жодзіна
6. Заслаўе
7. Узда
8. Салігорск
9. Віцебск
10. Орша
11. Магілёў
12. Бабруйск
13. Гомель
14. Жлобін
15. Брэст
16. Пінск
17. Баранавічы
18. Гродна
19. Слонім
20. Ліда

**Слонімская камвольна-прадзільная фабрыка (19):** ваўняныя тканіны
**Лідская абутковая фабрыка (20):** абутак

**«Стужка» (11):** тэкстыльная галантарэя, гардзіннае палатно, камплекты штор, медыцынскі перавязачны матэрыял
**«Магатэкс» (11):** тканіны водатрывалыя, інтэр'ерныя, тэхнічны тэкстыль
**Бабруйскі гарбарны камбінат (12):** гарбарная прадукцыя
**«Славянка» (12):** адзенне

**Брэст (15)**

**Брэсцкі панчошны камбінат:** калготкі, шкарпэткі
**«Брэсцкія дываны» (філіял ААТ «Віцебскія дываны»):** дываны

**«Палессе» (16):** пража, трыкатаж
**«Іскож» (16):** гарбарная прадукцыя
**Баранавіцкае вытворчае баваўнянае аб'яднанне (17):** баваўняныя тканіны, ніткі, пасцельная бялізна, абрусы і сурвэткі, ручнікі, бінты, марля

**Гомель (13)**

**«Камінтэрн»:** адзенне
**«8 Сакавіка»:** трыкатаж, шкарпэткі
**Гомельская абутковая фабрыка «Белфа» (14):** штучнае футра

Мал. 130. Прадпрыемствы лёгкай прамысловасці Беларусі

прадпрыемствы размешчаны ў Магілёве, Віцебску (мал. 130). З розных відаў хімічных і натуральных валокнаў выпрацоўваюць змяшаныя тканіны.

Па выпуску тканін лідзіруюць Віцебская, Брэсцкая і Гродзенская вобласці. Вытворчасць баваўняных тканін засяроджана ў Брэсцкай вобласці, тканін з хімічных валокнаў — у Магілёўскай, ільняных — у Віцебскай, ваўняных — у Мінску. Якімі прычынамі абумоўлена такая рэгіянальная канцэнтрацыя вытворчасці?

**3. Геаграфія швейнай вытворчасці.** Швейная вытворчасць атрымала шырокае развіццё ў Беларусі. Прадстаўлена буйнымі фабрыкамі і дробнымі прадпрыемствамі. Пераважная колькасць швейных вырабаў выпускаецца ў буйных гарадах. Вядучая роля ў прадпрыемстваў у Гродне, Дзяржынску, Салігорску і іншых гарадах (мал. 130). Па вытворчасці галаўных убораў вылучаецца Мінск. Пашыў швейных вырабаў з натуральнага і штучнага футра наладжаны ў Віцебску. Сыравінай з'яўляюцца шкуркі жывёл, якія пастаўляюцца зверагаспадаркамі краіны, і штучнае футра (Жлобін). Значная частка прадукцыі гэтых прадпрыемстваў ідзе на экспарт.

Трыкатажная вытворчасць прадстаўлена прадпрыемствамі, якія выпускаюць трыкатажнае палатно, панчошна-шкарпэткавыя вырабы. Выкарыстоўваецца пераважна мясцовая сыравіна. Трыкатажныя вырабы выпускаюцца ў многіх гарадах Беларусі буйнымі прадпрыемствамі, невялікімі атэлье, індывідуальнымі прадпрымальнікамі (мал. 130). Панчошна-шкарпэткавыя вырабы выпускаюцца ў Брэсце, Віцебску, Гродне.

Шырока вядомая за межамі Рэспублікі Беларусь прадукцыя фабрык «Світанак», «Калінка», «Алеся», «Палессе» і інш. Назавіце гарады, у якіх працуюць дадзеныя прадпрыемствы.

**4. Вытворчасць скуры, вырабаў са скуры і абутку.** Пры вырабе скуры выкарыстоўваецца мясцовая сыравіна: натуральныя і штучныя скуры. Найбуйнейшае прадпрыемства па вытворчасці скуры знаходзіцца ў аг. Гатава пад Мінскам. У Пінску працуе завод штучных скур. З натуральнай і штучнай скуры мінская фабрыка «Галантэя» вырабляе шырокі асартымент жаночых і мужчынскіх сумак, чамаданаў і іншай прадукцыі. Пальчаткі вырабляюць у Гродне.

Для вырабу абутку выкарыстоўваецца мясцовая і прывазная сыравіна. Буйныя абутковыя прадпрыемствы знаходзяцца ў Віцебску і Мінску. Спартыўны абутак выпускаюць у Лідзе, валёнкі — у Смілавічах.

Найбуйнейшы цэнтр па вытворчасці абутку — Віцебск, дзе размешчаны холдынг «Беларуская гарбарная кампанія "Марка"» і «Белвест». Адно з найстарэйшых прадпрыемстваў — «Абутак-Луч». Прадукцыя фабрык вызначаецца высокай якасцю.

**Падвядзём вынікі.** Галоўныя фактары размяшчэння лёгкай прамысловасці — спажывецкі і наяўнасць працоўных рэсурсаў. Тэкстыльная вытворчасць — самая буйная па аб'ёме прадукцыі.

***Праверце сябе.*** 1. Назавіце асноўныя фактары размяшчэння лёгкай прамысловасці. 2. Якія прадпрыемствы тэкстыльнай прамысловасці працуюць на мясцовай сыравіне, якія — пераважна на прывазной? 3. Назавіце буйныя прадпрыемствы па вытворчасці тканін у Беларусі.

***Праблемныя пытанні.*** 1. Чым выклікана рэгіянальная канцэнтрацыя вытворчасці прадукцыі лёгкай прамысловасці? 2. Чаму ў Беларусі ў апошнія гады назіраецца скарачэнне выпуску ваўняных тканін? 3. Якія, на ваш погляд, перспектывы развіцця лёгкай прамысловасці?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Распрацуйце буклет прадукцыі лёгкай прамысловасці для школьнай формы і прадстаўце ў ім беларускія брэнды.

## § 39. Геаграфія харчовай прамысловасці

***Успомніце.*** *Прывядзіце прыклады прадукцыі харчовай прамысловасці.*

**1. Асаблівасці развіцця і фактары размяшчэння вытворчасці харчовых прадуктаў.** Вытворчасць прадуктаў харчавання ў краіне — гэта сучасная галіна, якая дынамічна развіваецца і прадпрыемствы якой выпускаюць больш за чвэрць прадукцыі апрацоўчай прамысловасці, што гарантуе харчовую бяспеку краіны. У Беларусі вырабляюцца амаль усе неабходныя прадукты харчавання на прадпрыемствах дзяржаўнай і прыватнай формаў уласнасці. У сувязі з вялікай разнастайнасцю прадукцыі харчовая прамысловасць уключае больш за 20 вытворчасцей, кожная з якіх мае свае асаблівасці (мал. 131). Дзякуючы мадэрнізацыі і ўкараненню сучасных

| Харчовая прамысловасць | |
|---|---|
| → | Вытворчасць мяса і мясапрадуктаў |
| → | Вытворчасць малочных прадуктаў |
| → | Рыбная прамысловасць |
| → | Вытворчасць алеяў і жывёльных маслаў і тлушчаў |
| → | Вытворчасць прадуктаў мукамольна-крупяной прамысловасці |
| → | Вытворчасць цукру |
| → | Вытворчасць іншых прадуктаў (хлеба і хлебабулачных вырабаў, шакаладу і цукрыстых кандытарскіх вырабаў, харчовай солі, напояў і інш.) |

Мал. 131. Структура харчовай прамысловасці